Перспектыўнае планаванне работы выхавальніка па арганізацыі тэатралізаванай гульні

| Падрыхтоўка і правядзенне гульні-драматызацыі па рускай народнай казцы “Рукавічка” ў рознаўзроставай группе | |
|---|---|
| **Панядзелк** | Чытанне рускай народнай казкі “Рукавічка”<br>Мэта: фарміраваць цікавасць да твораў казачнага жанру, растлумачыць незразумелыя словы.<br>Разгляд ілюстрацый да казкі “Рукавічка”.<br>Мэта:зацікавіць дзяцей жаданнем ставіць тэатральныя пастаноўкі, актывізаваць слоўнік дзяцей. |
| **Аўторак** | Гутарка “Героі казкі “Рукавічка”<br>Мэта: фарміраваць інтанацыйную выразнасць мовы.<br>Дыдактычная гульня “Каго не стала?”.<br>Мэта: развіццё назіральнасці, памяці.<br>Выраб картак-масак “Героі казкі”.<br>Мэта: зацікавіць жаданнем удзельнічаць у казцы, развіваць творчую самастойнасць. |
| **Серада** | Прагляд мультфільма, створанага па казцы “Рукавічка”.<br>Мэта: развіццё умення дзяцей выяўляць характэрныя асаблівасці паводзігаў персанажаў.<br>Гульні на гукапераймальнасць у развіцці артыкуляцыйнага апарата. |
| **Чацвер** | “Падарунак звярам”. Выраб рукавічак з паперы для “звяроў”, якія будуць удзельнічаць у казцы.<br>Мэта: заахвоціць дзяцей да ўдзелу ў драматызацыі казкі.<br>Разгадванне загадак пра звяроў “Я ведаю!”<br>Мэта: замацаваць веданне асаблівасцей паводзінаў, знешняга выгляду звяроў – герояў казкі “Рукавічка”. |
| **Пятніца** | Гульня малой рухомасці “Знайдзі рукавічку”.<br>Мэта: працягваць развіваць дыялагічную мову дзяцей. Развіваць здольнасць дзяцей запамінаць словы герояў казкі. Удакладніць інтанацыйную выразнасць мовы дзяцей, уменне карыстацца інтанацыямі (жаласліва, радасна, сумна, злосна, здзіўлена).<br>“Казка заве!”. Выраб запрашэнняў на пастаноўку казкі “Рукавічка”.<br>Мэта: развіццё цікавасці дзяцей да тэатралізаванай гульні. Развіццё творчай самастойнасці. |